**Анатоль Трафімчык**
(Брэст)

## Да праблемы дзяржаўнасці распалавіненай Беларусі ў міжваенны перыяд: палітыка Крамля[1]

Гістарыяграфія гэтай тэмы ў ацэнках не такая стракатая, як стасоўна падзей 1914-1921 гг. на Беларусі, хоць у многім наследуе тэндэнцыі адносін да папярэдняга перыяду. Савецкія гісторыкі стваралі вобраз клапатлівай Масквы, якая, паводле іх, не толькі адстаяла беларускую дзяржаўнасць, на што пасягала капіталістычнае суседства, але і праводзіла беларусізацыю ды каранізацыю паралельна з павелічэннем („узбуйненнем”) тэрыторыі Савецкай Беларусі. Зразумела, дэтэрмінізм тых дзеянняў таксама кшталтаваўся ў парадыгме савецкай ідэалогіі. Сапраўдныя прычыны не агалошваліся. Замоўчваліся і многія іншыя дзеянні, якія характарызавалі маскоўскае кіраўніцтва не з лепшага для беларускае дзяржаўнасці боку. Усё зводзілася да высновы, што дзеянні Саветаў прагрэсіўныя для Беларусі, а шавіністычныя палітыкі II Рэчы Паспалітай і нацыяналістычна-буржуазныя дзеячы БНР толькі і думаюць, як спляжыць Беларусь. Кантраверсійныя меркаванні прадстаўлялі якраз беларускія эмігранты, аднак іх пазіцыі характарызаваліся: 1) запалітызаванасцю (як правіла, яны былі палітычна заангажаваны), 2) ярка выражанай палярнасцю, антынамічнасцю да пазіцый савецкіх даследчыкаў, што прыводзіла іншым разам да прынцопова супрацьлеглых адносін без абгрунтаванняў, 3) малалікасцю і слабай распаўсюджанасцю: вынікі той працы не выходзілі за межы эміграцкага асяродка (нават палітыкаў і навукоўцаў капіталістычнага свету тыя праблемы амаль не цікавілі). Прыадкрывацца рэчаіснасць міжваеннага перыяду пачала толькі ў канцы 1980-х гадоў. Гэта датычыцца і параўнаўча больш плюралістычнай па многіх іншых тэмах гістарычнай навукі ПНР, якой былі навязаны выгадныя Крамлю інтэрпрэтацыі. Тым не менш і сёння пакуль што разглядаемая праблема знаходзіцца на ўзроўні фрагментарнай рэпрэзентацыі, хоць у навуковы абарот уведзена ўжо нямала матэрыялаў. Варта разабрацца ва ўсіх аспектах праблемы, па магчымасці пераадолеўшы аднабокасць некаторых гістарычных даследаванняў.

[1] Праца выканана пры падтрымцы Карпарацыі Карнегі (Нью-Йорк) і адміністрацыйным садзеянні Амерыканскіх Саветаў па міжнароднай адукацыі (ACTR/ACCELS).

У перыяд 1917-1921 гг. зародкі беларускае дзяржаўнасці былі расціснуты молатам (бальшавіцкай Расіяй) на кавадле (II Рэчы Паспалітай), што замацавалі 18 сакавіка 1921 г. Шасціпавятовая Беларусь, як адзначае Я. Юхо, хоць і аб'яўлялася незалежнай, аднак фактычна і юрыдычна спачатку з'яўлялася аўтаномнай вобласцю ў складзе РСФСР, аб чым сведчыць і пастанова III з'езда Кампартыі Беларусі (лістапад 1920 г.), у якой аб прававым становішчы рэспублікі запісана: „Белоруссия, являясь Социалистической Советской Республикой, одновременно является составной частью РСФСР, и все органы в области общих мероприятий должны быть подчинены соответствующим комиссариатам РСФСР, однако они должны иметь определенную свободу в области разрешения вопросов местной жизни"[2]. А яшчэ праз пару гадоў І. Сталін у пасланні У. Леніну называе ўтварэнне БССР ды іншых рэспублік „игрой в независимость": „За четыре года гражданской войны, когда мы ввиду интервенции вынуждены были демонстрировать либерализм Москвы в национальном вопросе, мы успели воспитать среди коммунистов, помимо своей воли, настоящих и последовательных социал-независимцев, требующих настоящей независимости во всех смыслах. (...) Мы переживаем такую полосу развития (...) когда молодое поколение коммунистов на окраинах игру в независимость отказывается понимать как игру, упорно признавая слова о независимости за чистую монету и также упорно требуя от нас проведения в жизнь буквы конституции независимых республик"[3].

У Рызе быў скончаны першапачатковы складаны этап станаўлення новае беларускае дзяржаўнасці. Так атрымлася, што на працягу яго найбольшымі „ворагамі беларусчыны" (Янка Купала) праявілі сябе бальшавікі. Але менавіта яны былі вымушаны не толькі прызнаць нацыянальныя памкненні беларускага народа, але і арганізаваць яму хоць намінальную суверэннасць, кіруючыся, праўда, меркантыльнымі інтарэсамі — не выпусціць гэты народ са свае палітычнае арбіты. А варыянтаў вырашэння „беларускага пытання" на пачатак 1920-х гадоў існавала шмат. Т. Процька выдзяляе шэсць мадэлей: „антибелорусская модель автономных областей (через Облиспокомзап), национальная автономия (через Белнацком), независимая советская социалистическая республика (БССР, первое объявление), независимая социалистическая республика-буфер (ССРБ) и образцовая коммунистическая республика БССР"[4]. Між іншым, напэўна, варта дадаць, што да гэтага часу дэактуалізаваліся такія мадэлі эвентуальнага развіцця беларускае дзяржаўнасці, як пратэктарат Германіі або Польшчы,

[2] Я. Юхо, *Беларускія ўрады 1918-1921 гг. і іх паўнамоцтвы*, „Беларускі гістарычны часопіс", 1993, № 4, с. 68.

[3] Па: Т. С. Протько, *Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917-1941 гг.)*, Минск 2002, с. 323.

[4] Там жа, с. 321.

федэрацыя з апошняй, літоўска-беларуская дзяржава (па-савецку — ЛітБел, ці праждэкт В. Ластоўскага часоў Першае сусветнае вайны — у выглядзе адроджанага ВКЛ) і — самае галоўнае — адсутнасць беларускае дзяржаўнасці ў якой бы там ні было форме. Такім чынам, тузін.

Можна канстатаваць, што вынік вырашэння беларускага пытання ў выглядзе ССРБ не адпавядаў мэтам ні бальшавікоў, прасякнутых ідэяй сусветнае рэвалюцыі, ні адроджанай Польшчы з яе ідэаламі межаў 1772 г., ні тым больш незалежніцкім памкненням нацыянальных беларускіх сілаў, згуртаваных вакол ідэі БНР. Аднак ніводзін з бакоў не атрымаў і знішчальнага паражэння ў той барацьбе, якая пасля Рыгі не скончылася, а толькі перайшла ў больш спакойнае рэчышча, прыпыніўшы сваю актыўную фазу, што сведчыла аб эвентуальным вырашэнні праблемы ў бліжэйшай будучыні.

Неадназначнасць падзелу Беларусі ў 1921 г. адзначалася ўжо тады. Нехта інжынер Зябіцкі, згаданы Б. Тарашкевічам у curriculum vitae, спачуваў беларускаму руху: „Рыскі трактат робіць палажэньне трагічным, — аднак далей заўважаў наступнае. — Але ня трэба маркоціцца, таму што магчыма, што якраз падзел Беларусі стане паваротным пунктам яе адраджэньня: наступіць спадужаньне паміж абодвума бакамі граніцы, урады будуць старацца беларускае пытаньне выкарыстаць адзін супраць другога. Ён (Зябіцкі — А. Т.) і яго палітычныя прыяцелі належаць да тых, якія хацелі б судзеяць стварэньню беларускага П'емонту на занятай Польшчаю тэрыторыі"[5].

[5] Б. Тарашкевіч, *Аўтабіяграфія*, „Спадчына", 1996, № 4, с. 113-114. Як бачым з гісторыі, нацыянальная ці — карэктней будзе казаць — этнічная свядомасць славянскага насельніцтва ВКЛ у XVIII ст., падчас адзінаўладнага дамінавання і панавання пальшчызны сярод актыўнае часткі грамадства, рэзка прытупілася, прычым настолькі, што ў XIX ст., калі расейскі імператар захацеў „вярнуць" „адзінакроўных" братоў у лона „вялікарускай" культуры, распачаўшы працэсы арганічнага інтэгравання нашага краю ў Расею пры элімінацыі іншых уплываў, будучыя беларусы не прабудзіліся як аўтэнтычная нацыя, нягледзячы на агульнаеўрапейскую „вясну народаў". І наадварот, калі ў перыяд Першае сусветнае вайны на Беларусь сталі прэтэндаваць і з захаду, і з усходу (у значна меншай ступені з поўначы і поўдня таксама — адпаведна Літва і Украіна), мы назіраем рэзкую каталізацыю эвалюцыі нацыянальнае свядомасці і — як вынік — актывізацыю беларускага нацыянальнага руху. Адсюль выснова: аднабаковы татальны ўплыў, а не біпалярнае ўздзеянне, вядзе да субтылізацыі этнатоеснасці насельніцтва Беларусі з перспектывай поўнае асіміляцыі нацыі. Дарэчы, думка ў прынцыпе не новая для гістарыяграфіі: польскі гісторык Рышард Радзік заўважае неспрыяльнасць для фармавання беларускае нацыі знаходжання ўсёй тэрыторыі Беларусі ў расейскай дзяржаве, бо — у адрозненне ад украінцаў (частка якіх знаходзілася ў Галіцыі) ды літоўцаў (частка якіх знаходзілася ва Усходняй Прусіі) — яны не мелі свайго П'емонту і „не маглі выкарыстаць сутыкненне аднаго захопніка з другім" (Р. Радзік, *Прычыны слабасьці нацыятворчага працэсу беларусаў у XIX-XX ст.*, „Беларускі Гістарычны Агляд", 1995, т. 2, сш. 2, с. 222).

Як заўважае выдатны знаўца гісторыі і культуры міжваеннае Заходняе Беларусі Арсень Ліс, падзел зусім не азначаў спынення ў развіцці кансалідацыі беларускага народа, нацыянальная ідэя эвалюцыянавала[6]. І ў гэтым жа істотнае значэнне адыграў менавіта падзел Беларусі. Лагічна будзе меркаваць у сувязі з развіццём беларускае нацыянальнае ідэі, што яно вяло менавіта да ўз'яднання нацыі. Але гэтая кансалідацыя была праведзена не самімі беларусамі, а знешнепалітычнай імперскай сілай, якая імкнулася скіраваць працэс аб'яднання Беларусі ў неабходнае ёй рэчышча, выкарыстаўшы яго ў чарговы раз як (геа)палітычную карту.

Рыжскі дагавор прадугледжваў фармальна не такія ўжо і малыя правы для беларусаў ІІ Рэчы Паспалітай[7]. Дэ-юрэ і ССРБ (потым БССР) мела суверэннасць (яе юрыдычны статус, безумоўна, павышаўся з утварэннем СССР, у чым Савецкая Беларусь прымала непасрэдны ўдзел як юрыдычна самастойны суб'ект права, — магчыма, тым самым Масква распачала палітыку задабрэння беларускіх нацыянальных сілаў па абодва бакі мяжы з мэтай стварэння сімпатый да сябе, якія былі да таго часу разгублены нават у асяродку пракамуністычнага беларускага руху). Беларускі філосаф Ігар Бабкоў нават небеспадстаўна выказвае думку, што „БССР найбольш адэкватна можа быць зразумета не як поўны правал нацыянальнага беларускага руху, а як посткаляніяльны кампраміс", выкліканы збегам шэрага фактараў, да таго ж, нагадвае мысляр, „беларуская савецкая дзяржаўнасьць выклікала напачатку дастаткова аптымістычныя пачуцьці"[8]. Больш таго, у сваёй кнізе *За 25 гадоў*, выдадзенай у Вільні ў 1928 г. А. Луцкевіч разглядае Савецкую Беларусь як здзейснены часткова „наш (дзеячаў БНР — А. Т.) дзяржаўны ідэал, абвешчаны перад гэтым актам рады Рэспублікі 25 сакавіка 1918 года"[9]. Тым больш што самі дзеячы БНР пры адступленні немцаў лічылі магчымым ступіць на шлях перагавораў з урадам РСФСР напярэдадні стварэння Савецкай Беларусі з мэтай арганізацыі кааліцыйнага ўрада апошняй[10]. Гэта дало падставы яшчэ аднаму беларускаму філосафу Валянціну Акудовічу пайсці яшчэ далей, назваўшы БНР і БССР ледзь ні блізнюкамі, ва ўсялякім разе да 1929 г.[11] Сапраўды, прынамсі

[6] А. Ліс, *Заходняя Беларусь: культурная спадчына забытага дваццаціголдзя*, „Спадчына", 1994, № 6, с. 38-39.

[7] Гл.: *Мирный договор между Россией и Украиной, с одной стороны, и Польшей — с другой*, „Спадчына", 1993, № 4, с. 17.

[8] І. Бабкоў, *Генэалёгія беларускай ідэі. Зь лекцыяў для Беларускага Калегіюму*, „ARCHE-Пачатак", 2005, № 3, с. 161.

[9] Па: *Так начиналась национальная трагедия*, „Неман", 1992, № 9, с. 137.

[10] Ю. Туронак, *Мадэрная гісторыя Беларусі*, Вільня 2006, с. 72.

[11] В. В. Акудовіч, *Код адсутнасці. Асновы беларускай ментальнасці*, Мінск 2007, с. 53-59.

юрыдычна Беларусь перастала быць безаблічным «Северо-Западным краем» і набыла пэўную кадыфікацыю на міжнародна-прававым полі, — і гэта ўжо, безумоўна, прагрэс, які ў гісторыі з гледзішча нацыянальнага развіцця мог бы застацца, бадай, неаспрэчным, калі б не далейшы брутальны разгром дасягненняў на ніве беларусчыны.

Пры рэалізацыі праў паводле Рыжскага дагавора беларусы як нацыя па абодва бакі меліся адбыцца. Але планы метраполій былі інакшыя.

У Савецкім Саюзе, а значыць і ССРБ, у 1920-х гг. закінулі нажыўку каранізацыі і беларусізацыі: маўляў, правы беларусаў і меншасцей у Савецкай Беларусі вытрымліваюцца. Аднак гэта было толькі прынадай для акумуляцыі, кансалідацыі пад адным дахам беларускіх нацыянальных сіл розных палітычных поглядаў з мэтай іх далейшай элімінацыі. Так, як сведчаць, напрыклад, матэрыялы пра значэнне Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу 1926 г., адной з галоўных мэт якой было засведчыць, як сказана ў назве публікацыі, бурнае нацыянальнае адраджэнне ў Савецкай Беларусі пад уплывам камуністаў. Таму форуму імкнуліся надаць міжнародны рэзананс[12]. Дый наогул, як сведчаць сучасныя даследаванні, беларусізацыя — гэта быў усяго толькі крок для выяўлення і элімінацыі яе перадумоў і праваднікоў, гэта быў сродак для вырашэння „шэрага вельмі важных задач унутранай і знешняй палітыкі", прымяненне якога пасля выканання яго функцыі было згорнута[13]. У прыватнасці мелася на мэце не толькі інспіраванне будучага аб'яднання з Заходняй Беларуссю шляхам стварэння лепшых (асабліва знешне, па форме) варункаў і перадумоў для нацыянальнага развіцця ў Савецкай Беларусі, але і імкненне ліквідаваць урад БНР, які і надалей праводзіў актыўную палітычную дзейнасць, што з'яўлялася адным з чыннікаў беларусізацыі і каранізацыі ў ССРБ. А пасля роспуску таго ўрада (што было юрыдычна неправамоцна), арганізаванага Аляксандрам Цвікевічам, нават шчыра прабальшавіцкі паэт Міхась Чарот, сустрэўшыся з ім у Германіі, рэзка папракаў яго за здзейснены акт: „Гэта памылка! Пакуль вы былі тут, за мяжой, нам лягчэй было там весці нацыянальную палітыку..."[14]. Гэта сапраўды так, бо напярэдадні савецкія палітыкі, распрацоўваючы праграму дачыненняў да беларускага пытання, хацелі высветліць, што можна зрабіць, каб выклікаць сімпатыі

[12] І. Раманава, *Беларусь перажывае бурнае нацыянальнае адраджэнне пад уплывам камуністаў. Акадэмічная канферэнцыя 1926 г. у галасох вiдавочцаў*, „ARCHE-Пачатак", 2006, № 1-2, с. 92-104.

[13] І. Клімаў, *Беларусізацыя ў дакументах*, „Беларускі Гістарычны Агляд", 2001, т. 8, сш. 1-2 (14-15), с. 273-295. Гл. таксама: *Беларусізацыя: 1920-я гады: Дакументы і матэрыялы*, Мінск 2001, сс. 270.

[14] Па: Я. Янушкевіч, *Неадменны сакратар Адраджэння, альбо Эсэ пра Вацлава Ластоўскага*, „Полымя", 1994, № 5, с. 164.

беларускае масы ў Заходняй Беларусі да БССР, і ў прыватнасці ў 1923 г. А. Луцкевіч праз С. Рак-Міхайлоўскага атрымаў просьбу распрацаваць кароткі даклад пра тое, якія мерапрыемствы былі б пажаданы ў БССР з гледзішча заходніх беларусаў, у ліку якіх перадусім ставілася пытанне пра павелічэнне БССР, пра культурную працу, пра амністыю дзеячам БНР[15]. Бальшавікі мелі канкрэтныя планы па ліквідацыі замежнага нацыянальнага актыву беларусаў, дзеля чаго выкарыстоўвалі ў прапагандысцкіх мэтах і выдатных прадстаўнікоў з Савецкае Беларусі. Так, пад канец 1925 г. такую замежную паездку арганізавалі з удзелам Цішкі Гартнага, Янкі Купалы і Міхася Чарота пад прыглядам „дыпламата" ад адпаведных органаў Аляксандра Ульянава. Прычым, мяркуючы па ўсім, беларускія літаратары разумелі ў якой якасці яны служаць таталітарнай машыне, якая тады толькі набірала абароты. А А. Ульянаў жа потым засведчыў: „Когда меня послали на работу в Польшу, основной момент был раскол... За границей имелся целый ряд белорусских эмигрантских групп... Эти группы противопоставляли себя Советскому правительству, везде выставляя себя как «представителей народа». Наша задача была обезглавить, обезвредить эти группы. Надо было связаться с этими группами, поставить перед ними вопрос, что если они явятся, вернутся сюда и будут честно работать, здесь им будет дана амнистия. Это было проделано"[16].

Зрэшты, улічваючы выразаныя савецкай цэнзурай словы аднаго з герояў рамана М. Зарэцкага „Крывічы" (1929) Сьляпня (Антон Адамовіч бачыць гэтага літаратурнага персанажа ў якасці „перададзенае трыбуны" — метад укладвання думак аўтара ў вусны дзеючых асоб, не абавязкова пратаганістаў), і сённяшняя інтэпрэтацыя гістарычнай навукі беларусізацыі як тактычнага кроку далёка няновая, прычым ужо для тых часоў і для савецка-беларускага дыскурсу (перапрашаю за аб'ёмную цытату — яна вартая таго): „А вы ведаеце, што такое бе-ла-ру-сі-за-цыя? Га? Хо-хо-хо... Гэта, брат, хітрая, ой, хітрая штука... Гэта стаўка на форму... Так, так, на форму... Аўладаць формай, адлучыць яе ад зьместу, вылягчыць яе, выкруціць, высушыць... і выкінуць вон... Ха-ха-ха... Што — хітра, га? Тонка? (...) Навучыцца аўладаць беларускай мовай, каб лягчэй было згаварыцца зь сялянамі, скажам, пры зьбіранні падатку, гэта ня будзе разьвязаньне нацыянальнага пытаньня. Гэта будзе толькі ўсяго замена каленіяльнай палітыкі — „салдацкай" на каленіяльную палітыку — „езуіцкую". Гэта страшэнна шкоднае звужаньне праблемы нацыянальнай культуры. Гэта палітыка гандляроў з рынку,

[15] *Апостол национального возрождения*, „Неман", 1995, № 1, с. 156.

[16] Па: У. Някляеў, *Шлях. Папулярны біяграфічны нарыс*, „Дзеяслоў", 2007, № 3, с. 246-247.

якія (я спэцыяльна гэта назіраў) зьвяртаюцца заўсёды да сялян у роднай іхняй мове, каб... лягчэй абдурыць іх”[17]. А трохі раней пра манапалізацыю бальшавікамі беларускага руху як тактычны крок, знаходзячыся ў Празе, казаў паэт Уладзімір Жылка[18]. Такім чынам, сапраўдная стратэгічная мэта бальшавіцкага Крамля адносна лаяльнае нацыянальнае палітыкі на Савецкай Беларусі ў 1920-я гады (прад)бачылася многімі (але не ўсімі) актывістамі беларускага руху (прычым па розныя бакі мяжы) яшчэ задоўга да дасягнення канчатковага выніку.

Тым не менш намінальная суверэннасць рэспублікі дазволіла ўжо адпачаткова казаць пра яе уніфікацыйнае для беларускіх тэрыторый значэнне; і ў пацверджанне Масква пасля знікнення актуальнасці значэння ССРБ як буфернае зоны ад капіталістычнага атачэння правяла два так званыя ўзбуйненні рэспублікі, хоць у канцы 1920 г. бальшавікі зусім не збіраліся „ўзбуйняць”[19] Беларусь з-за адсутнасці сэнсу[20]. Народны камісарыят замежных спраў РСФСР, як паведамляецца ў яго цыдулцы ад 6 лістапада 1920 г., лічыў „нежаданым далучэнне да Беларусі якіх бы там ні было частак Віцебскай або Магілёўскай губерняў”[21]. 17 лістапада 1920 г. кіраўніцтва Расійскае кампартыі на нарадзе адзначала, што вырашэнне пытання пра тэрыторыю Савецкае Беларусі на дадзены момант з'яўляецца нясвоечасовым, бо, як напярэдадні заявіў наркам замежных спраў Р. Чычэрын, было яшчэ невядома, „праз якія

[17] Па: А. Адамовіч, *Да гісторыі беларускае літаратуры*, Мінск 2005, с. 926.

[18] Па: Я. Янушкевіч, *Неадменны сакратар Адраджэння, альбо Эсэ пра Вацлава Ластоўскага*, „Полымя”, 1994, № 5, с. 165. Гл. таксама тоесную думку замежнае гістарыяграфіі на гэты конт: Р. Лінднэр, *Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX-XX ст.*, Санкт-Пецярбург 2003, с. 168.

[19] Пра развагі, якія дазволілі тэрмін узяць у двукоссе, гл.: А. Трафімчык, *Аб'яднанне Беларусі 17 верасня 1939 г.*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne”, 2004, № 21, с. 199-206. Праўда, і прыніжаць значэнне павелічэння тэрыторыі беларускае рэспублікі нельга: як і стварэнне Савецкае Беларусі, так і пашырэнне яе межаў справядліва будзе лічыць пэўным здабыткам развіцця беларускага нацыянальнага руху, але не толькі, дакладней, не столькі дзякуючы савецкай уладзе, колькі насуперак ёй, праз што выяўляецца пэўная жыццяздольнасць беларускае ідэі і патэнцыял яе дзеячаў, які такім чынам выяўляўся бальшавіцкім кіраўніцтвам, каб затым быць элімінаваным (пра гэта згадаем і ніжэй). У любым выпадку вызначэнне тых працэсаў як „узбуйненне” робіць „падкоп” пад карэктнасць дэфініцыі „аб'яднанне” 1939 г. і наадварот.

[20] *Знешняя палітыка Беларусі: Зборнік дакументаў і матэрыялаў*, т. 1 (1917-1922 гг.), Мінск 1997, с. 214; H. Głogowska, *Białoruś 1914-1929. Kultura pod presją polityki*, Białystok 1996, s. 76. Першакрыніца: Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НАРБ), ф. 4, воп. 1, спр. 40, арк. 27.

[21] Цыт. па: А. Грыцкевіч, *Гісторыя геапалітыкі Беларусі*, „Спадчына”, 1994, № 4, с. 55.

перыпетыі можа прайсці лёс Беларусі”[22]. Па гэтым можна справядліва меркаваць, што планы так званага ўзбуйнення Савецкае Беларусі існавалі ўжо на той час. Але неўзабаве той сэнс з’явіўся: такі ход Савецкую Беларусь рабіў большай і па тэрыторыі, і па насельніцтве за заходнебеларускія землі ў складзе Польшчы[23], — не далучаць жа было большую частку да меншай. (Перад так званым узбуйненнем, у 1923 годзе, як меркаваў агент дэфензівы, нават існаваў план хаўрусніцтва з яшчэ слабой Нямеччынай выступіць супраць ІІ Рэчы Паспалітай[24], што на новым вітку савецка-нямецкіх стасункаў усё ж было зрэалізавана.) Да таго ж менавіта з падачы Крамля была створана Кампартыя Заходняе Беларусі (1923 г.) — упершыню „крэсы паўночна-ўсходнія” атрымалі (пра)савецкую інтэрпрэтацыю, у якой да таго ж падкрэслівалася этнічная беларускасць зямель[25]. Сэнс яе быў у інспіраванні справядлівасці эвентуальнага аб’яднання Беларусі (першапачаткова праз узброенае паўстанне[26], якое, аднак, не перарасло маштабаў партызанскае барацьбы, ды яго ідэя неўзабаве была адкінута, а барацьба згорнута). Крэмль „падабраў”, пераняў назву „Заходняя Беларусь” у нацыянальных сілаў, якія ўжывалі яе самае позняе з 1919 г.[27]

[22] Па: У. Ладысеў, *Расійскі фактар і беларуская дзяржаўнасць у 20-я гады XX ст.*, „Беларуская думка”, 2006, № 2, с. 121. Першакрыніца: НАРБ, ф. 4863, воп. 3, спр. 478, арк. 74-75.

[23] Напачатку Савецкая Беларусь займала плошчу ў 52,4 тысячы км$^2$; („Далі шэсць паветаў — дзякуй і за гэта”, — выказаў свае адносіны да падзей падзелу Беларусі паміж „ворагамі беларусчыны” наш класік Янка Купала). Прадстаўнікі БНР ацэньвалі беларускія тэрыторыі, якія апынуліся пад акупацыяй камуністычнае Расіі, у больш за 206 тысяч км$^2$ (*Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі*, т. 1, кн. 2, Вільня — Нью-Ёрк — Менск — Прага 1998, с. 1220). У 1939 г. напярэдадні вераснёўскіх падзей БССР ахоплівала 125, 9 тысяч км$^2$ (У. Ф. Ладысеў, *Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917-1939 гг.)*, Мінск 2003, с. 200).

[24] *Рапарт Рамуальда Зямкевіча ў ІІ аддзел Генеральнага штаба ад 7 траўня 1923 г.*, „ARCHE-Пачатак”, 2005, № 6, с. 243. Гл. таксама: А. А. Пронин, *Советско-германские соглашения 1939 г. Истоки и последствия*, [у:] http://history.machaon.ru/all/number_10/pervajmo/pronin_print/index.html.

[25] Цікава, што геапалітычны тэрмін „Заходняя Беларусь” трохі раней фігураваў сярод назваў (з польскага боку) Віленшчыны, адарванае у 1921 г. ад суверэннае Літвы і неўзабаве далучанае да ІІ Рэчы Паспалітае, аднак насуперак незадаволеным беларускім дзеячам ён быў уласнаручна выкраслены Ю. Пілсудскім (Б. Тарашкевіч, *Аўтабіяграфія*, „Спадчына”, 1996, № 4, с. 92-132; А. Ліс, *Цяжкая дарога свабоды: Артыкулы, эцюды, партрэты*, Мінск 1994, с. 215; А. Трусаў, *Сярэдняя Літва*, „Беларускі гістарычны часопіс”, 2004, № 11, с. 12). У гісторыі той рэгіён застаўся пад назвай «Litwa Środkowa» (Сярэдняя Літва), прыдуманай Ю. Пілсудскім на хаду, проста ў дарозе на перамовы з літоўскім бокам.

[26] Гл., напрыклад: *Рапарт Рамуальда Зямкевіча ў ІІ аддзел Генеральнага штаба ад 26 сакавіка 1923 г.*, „ARCHE-Пачатак”, 2005, № 6, с. 234.

[27] Гл., напрыклад: *Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі*, т. 1, кн. 1, с. 81;

Цікава будзе зазначыць, што, як паведамляе Антон Адамовіч, напачатку 1920-х гадоў у якасці тэарэтычнае варыяцыі развіцця партызанскае барацьбы распрацоўвалася і зусім неардынарная задумка ўз'яднання Беларусі пад савецкім дахам, што стала вядомай пад назовам „мангольскага праекта".

„Меркавалася трансфармаваць БССР у тэарэтычна незалежную дзяржаву пад пратэктаратам Савецкага Саюзу накшталт Мангольскай Народнай Рэспублікі. Плянавалася, што пры падтрымцы Саветаў беларускі нацыянальны рух у Польшчы ўзьніме „паўстаньне" за аддзяленьне беларускай тэрыторыі. У той-жа час адбудзецца „паўстаньне" і ў Савецкай Беларусі, якая рэалізуе сваё права на „аддзяленьне", і дзьве часткі Беларусі аформяць тэарэтычна незалежную дзяржаву, фактычна пад савецкім пратэктаратам, як і Мангольская Народная Рэспубліка. Сам СССР пры гэтым ня выглядае агрэсарам, а, наадварот, — такім самым (калі яшчэ й ня больш) „пацярпелым", як і Польшча.

Цяжка сказаць, ці меў „мангольскі праект" у сваёй аснове пэўныя рэальныя намеры, ці з самага пачатку быў задуманы як чыстая правакацыя, якой у далейшым абярнуліся і „нацыянальны НЭП", і „беларусызацыя", і ўся бальшавіцкая дзейнасьць у Заходняй Беларусі. Ува ўсялякім выпадку, у свой час матываваньне яго выглядала праўдападобным"[28].

К. Езовитов, *Белоруссы и поляки. Документы и факты изъ истории оккупаціи Белоруссіи поляками въ 1918 и 1919 годахъ*, Ковна 1919, с. 50. Таму польскія гісторыкі не маюць рацыі, кажучы, што тая назва ўсталявалася з заснаваннем Кампартыі Заходняй Беларусі (і па сённяшні дзень многія думаюць, што назва «Заходняя Беларусь» узнікла ў 1923 г.: B. Bernacki, *Wybory do Zgromadzenia Ludowego Zachodniej Białorusi 22 października 1939 r. Kampania wyborcza w prasie polskojęzycznej*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2003, nr 20, s. 153). Дый беларуская акадэмічная гістарыяграфія наконт гэтага пытання таксама далёка не ўся абазнаная, пра што сведчыць прыклад У. Ладысева, які складванне паняцця адносіць да пачатку 1920-х гг. (У. Ладысеў, *Аб'яднанне беларускай нацыі (да 65-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР)*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2004, № 9, с. 8) ці І. Цітовіча з яго ж кіраўніком М. Сташкевічам (В. Цітовіч, *Краязнаўчы рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Дыс. ... канд. гіст. навук.*, Мінск 2006, с. 4). Праўда, трэба прызнаць, што менавіта з утварэннем тае партыі такая назва стала выкарыстоўвацца часцей і сярод незалежнікаў, што можна прасачыць, напрыклад, па архівах БНР (*Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі*, т. 1, кн. 1-2). На такім польска-беларускім гістарыяграфічным фоне выгадна выдзяляецца ўжо, на жаль, адна з апошніх аддадзеных у друк самім аўтарам публікацый У. Міхнюка (У. Міхнюк, *Заходняя Беларусь: граніцы, тэрыторыя і насельніцтва (гістарыяграфічныя нататкі)*, „Беларускі гістарычны часопіс", 2004, № 11, с. 14-21). Ён аргументавана ўказвае, што назоў «Заходняя Беларусь» выкарыстоўваўся ўжо ў 1918-1919 гг. Увогуле ж, відаць, было б слушным шукаць выкарыстанне такога геапалітоніма пачынаючы з усталявання руска-германскае лініі фронту ў 1915 г., якая падзяліла Беларусь з поўначы на поўдзень.

[28] А. Адамовіч, *Да гісторыі беларускае літаратуры*, Мінск 2005, с. 851.

А паводле паведамлення польскае крыніцы, падчас існавання Сярэдняй Літвы (1920-1922 гг.) быў яшчэ адзін варыянт паўстання. „Калі б пачалася ўзброеная барацьба Ковенскай Літвы і Беларусі з Польшчай, павінна было пачацца антыпольскае паўстанне ў той частцы Беларусі, якая, згодна з Рыскай дамовай, належала Польшчы. У гэтым выпадку на дапамогу Літве і Беларусі прыйшлі б савецкія войскі". Пасля выбараў у Сейм і Сенат II Рэчы Паспалітай, адносна паспяховых для беларусаў і іншых нацыянальных меншасцей, па паведамленні той жа крыніцы, паўстанне на „крэсах усходніх" павінна было праявіць ініцыятыву ў паслабленні вайсковых сілаў польскае дзяржавы, з чаго „мелася скарыстаць Савецкая Расія, прайсьці праз Польшчу і злучыцца зь Нямеччынай. Пасьля гэтага мусіла быць утвораная незалежная Беларусь, магчыма, сфэдэраваная зь Літвой ці Савецкай Расіяй"[29]. Аднак гістарычныя варункі аказаліся неспрыяльнымі для далучэння заходніх зямель Беларусі пры дапамозе паўстання, таму Масква вымушана была шукаць іншыя шляхі.

Досвед гістарыяграфіі сведчыць, што і да сённяшняга часу многія не ведаюць рашаючых чыннікаў павелічэння Савецкае Беларусі ў сярэдзіне 1920-х гадоў. Як было сказана ў пункце 3-м сакрэтнага дакумента „В комиссию политбюро ЦК ВКП(б) по вопросу о расширении границ БССР", „основной решающий аргумент за расширение границ БССР — в ближайшее время — определяется политикой Польши": меліся звесткі, што Пілсудскі збіраўся правесці шэраг рэформаў адносна нацыянальных меншасцей, у тым ліку беларусаў[30]. І ў сувязі з гэтым Крамлю неабходна было прэвентыўна прымаць крокі ў сваю чаргу, і — як паказаў час — „вяртанне ў склад БССР шэрагу ўсходнебеларускіх паветаў мела вялікі рэзананс у Польшчы і Заходняй Беларусі"[31]. А наперадзе ж была яшчэ і перспектыва вяртання самое Заходняе Беларусі.

Наогул савецкі ўрад стрымліваўся ад публічных заяў пра неабходнасць перагляду савецка-польскае мяжы — у адрозненне ад прадстаўнікоў саюзных рэспублік (у дадзеным выпадку прыводзіцца прыклад старшыні ўрада Украінскае ССР 1924 г.), аднак у сакрэтнай перапісцы народнага камісарыята замежных спраў дагавор з Польшчай аб нена-

[29] *Кароткі нарыс беларускага пытаньня*, „ARCHE-Пачатак", 2007, № 11, с. 230, 262 і інш.

[30] У. Ф. Ладысеў, *Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі...*, с. 296. Гл. параўнанне з палітыкай Масквы адносна Украіны і Фінляндыі: Трафімчык А. Рэцэнзія на: У. Ф. Ладысеў, *Паміж Усходам і Захадам: Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі...*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", Białystok, 2006, № 26, с. 288-299 (памылкова пад прозвішчам Дзмітрый Крывашэй).

[31] С. Хоміч, *Асноўныя этапы фармавання тэрыторыі БССР (1918-1926)*, „Беларускі Гістарычны Агляд", 2000, т. 7, сш. 2 (13), с. 360, 363.

падзе разглядаўся не болей чым тактычны ход[32]. Малады расійскі даследчык А. Пронін таксама заўважае, „что и советское руководство, заключив мирный договор с Польшей в 1921 году и тем формально признав восточную польскую границу, неизменно подчеркивало свое недовольство сложившейся ситуацией. Так, посол Германии в СССР в 20-х — начале 30-х годов фон Дирксен 17 октября 1931 г. писал из Москвы о своей встрече с Ворошиловым, утверждая, что границы с Польшей Ворошилов считает, как это он подчеркивал в разговоре с начальником Генерального штаба рейхсвера Адамом, „неокончательными" (...) 12 декабря 1931 года Ворошиловым в беседе с фон Дирксеном были сказаны следующие слова: „ни при каких обстоятельствах, разумеется, не может быть и речи о какой-либо гарантии польской западной границы; советское правительство — принципиальный противник Версальского договора"[33]. Дый сам Сталін публічна праз нямецкага пісьменніка Эміля Людвіга ў гутарцы 13 снежня 1931 г. выказваўся пра ранейшае непрызнанне межаў Версальска-Вашынгтонскае сістэмы, у тым ліку і ў першую чаргу Польшчы, нягледзячы на гатоўнасць падпісаць з ёй пакт аб ненападзе, ён азначаў бы не прызнанне яе межаў, а непрымяненне „насілля, нападу для таго, каб змяніць граніцы Польшчы, СССР або парушыць іх"[34].

У II Рэчы Паспалітай беларусы афіцыйна былі нацменшасцю, што таксама паспрыяла таму інспіраванню, якому паверылі нават некамуністычныя нацыянальныя дзеячы на ніве беларусчыны. Асабліва, мусіць, з-за таго, што дамаганні Б. Тарашкевіча і яго хаўруснікаў у палітыцы здабыць аўтаномію не рэалізаваліся. Тая аўтаномія (хаця б фармальная) у вялікай ступені пазбавіла б Маскву глебы для інспіравання эвентуальнага аб'яднання Беларусі; да таго ж пры карэктным правядзенні адміністрацыйнае мяжы аўтаноміі захоп у 1939 г. Савецкім Саюзам Ломжыншчыны яскравей выявіў бы гвалт і фарысейства маскоўскіх палітыкаў стасоўна каланізуемых народаў. Думаецца, менавіта сепаратысцкія памкненні Б. Тарашкевіча, якія маглі б прынесці нямала шкоды пры рэалізацыі планаў Крамля ды іх папулісцкім вытлумачэнні, пазней падштурхнулі бальшавікоў спярша наладзіць яму эміграцыю ў БССР, а затым рэпрасаваць яго (як і многіх іншых нацыянальных дзеячаў заходняй часткі Беларусі). У гэтай сувязі вартае ўвагі небеспадстаўнае меркаванне Р. Лазька пра разгром Беларускае сялянска-работніцкае грамады (ачольваў Б. Тарашкевіч), якая стала ахвярай дзвюх дык-

[32] М. Мезга, *Мяжа канфрантацыі*, „Беларуская мінуўшчына", 1996, № 2, с. 29.
[33] А. А. Пронин, *Советско-германские соглашения 1939 г. Истоки и последствия*, [у:] http://history.machaon.ru/all/number_10/pervajmo/pronin_print/index.html.
[34] І. В. Сталін, *Творы*, т. 13, Мінск 1951, с. 114-116.

татур — варшаўскае ды маскоўскае[35]. „Савецкае кіраўніцтва прыкладала актыўныя намаганні, каб не дапусціць стварэння і ўмацавання нацыянальных аб'яднанняў, гатовых да супрацоўніцтва з польскім урадам"[36]. Канешне, крамлёўскім бальшавікам было непамысна бачыць 8-тысячную кампартыю Савецкае Беларусі на фоне больш чым 100-тысячнае (!) Грамады[37]; тым часам, па больш дакладных звестках, у кампартыі Заходняй Беларусі мелася не больш чатырох тысяч членаў і недзе столькі ж належала да Камуністычнага саюза моладзі[38]. Варта заўважыць, што пасля разгрому Грамады яе сябры не пайшлі ў КПЗБ — саюзніка па антыпольскай барацьбе. Дык мо і не такое шчыльнае супрацоўніцтва ў іх было[39], як спрабуюць запэўніць многія, у тым ліку сучасныя, гісторыкі?[40] Тым больш, што радыкальныя метады барацьбы КПЗБ нaклiканнем рэпрэсій нярэдка псавалі ўздым беларускага нацыянальнага руху. Дый сапраўдныя намеры да Грамады Крэмль выявіў потым, абвінавацiўшы ўдзельнікаў руху ў спробе ўтварэння ў межах Польшчы буржуазнае беларускае дзяржавы[41], бо гэта відавочна пахіснула б фарміраванне стэрэатыпу пра эвентуальнасць аб'яднання толькі пад савецкім дахам.

З іншага ж боку неабходна адзначыць, што на выбарах у Сейм пасля ліквідацыі Грамады за камуністаў прагаласавала 26% — амаль у 2,5 разы больш чым за іншых беларускіх палітыкаў[42]. Відаць, што палі-

[35] Гл. падрабязней: Р. Лазько, *Хто ж знішчыў „Грамаду"?*, „Беларуская мінуўшчына", 1994, № 2, с. 46-49.

[36] М. Мезга, *Мяжа канфрантацыі*, „Беларуская мінуўшчына", 1996, № 2, с. 31.

[37] Па: А. Адамовіч, *Да гісторыі беларускае літаратуры*, Мінск 2005, с. 860; У. А. Палуян, *Беларуская сялянска-работніцкая грамада*, [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т.*, т. 1, Мінск 1993, с. 416.

[38] У. Ладысеў, *Камуністычная партыя Заходняй Беларусі*, [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т.*, т. 4, Мінск 1997, с. 67; М. Бобер, *Камуністычны Саюз моладзі Заходняй Беларусі*, [у:] *Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т.*, т. 4, Мінск 1997, с. 76; А. Ліс, *Заходняя Беларусь: культурная спадчына забытага дваццацігоддзя*, „Спадчына", 1994, № 6, с. 40, 43.

[39] Пра гэта, напрыклад, гл: А. Вашкевіч, *Нашы сцягі над Заходняй*, „ARCHE-Пачатак", 2007, № 4, с. 78-91.

[40] Найбольшую ўвагу тут заслугоўваюць перадусім працы Анатоля Сідарэвіча, не пазбаўленыя рацыі, напрыклад: А. Сідарэвіч, *Антон Луцкевіч і Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада*, „ARCHE", 2007, № 9, с. 192-218. У гэтым артыкуле аўтар педалюе тэму разгортвання дзеянняў Грамады фактычна пад камуністычным дахам ды яе супрацоўніцтва з камуністамі, тым не менш ён не закрывае пытання. У любым выпадку відавочна адно: Грамада не стала марыянеткай бальшавікоў, за што і паплацілася.

[41] E. Mironowicz, *Białorusini w polityce piłsudczyków w latach dwudziestych*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2005, № 23, s. 58.

[42] У. Ладысеў, *Цяжкі шлях выпрадаванняў*, „Беларускі гістарычны часопіс", 1994, № 1, с. 85. Першакрыніца: НАРБ, ф. 60, воп. 6, спр. 73, арк. 3.

тычныя прыхільнікі ліквідаванае Грамады пераарыентаваліся на КПЗБ — параўнаўча з іншымі найбольш блізкую ідэйна арганізацыю. Аднак ліквідацыя КПЗБ у 1938 г. засведчыла, што нават камуністы-„заходнікі” не справіліся з ускладзенымі на іх Масквой задачамі і спадзяваннямі. У адрозненне ад БСРГ (нават пасля яе разгому) КПЗБ пры наяўнасці большых, чым мела тая ж Грамада, субсідый так і не стала народным палітычным рухам, што, напэўна, кампраметавала камуністаў увогуле.

У выніку да 1939 г. па абодва бакі мяжы ўсталяваўся стэрэатып пра будучае аб’яднанне як далучэнне Заходняй Беларусі да Беларусі Савецкай, чым быў створаны пэўны грунт для такога аб’яднання. Усталяванню стэрэатыпу пра аб’яднанне Беларусі пад савецкай эгідай садзейнічала сваёй няўмелай палітыкай і кіраўніцтва II Рэчы Паспалітай. Відавочна, польская ўлада разумела, што здзейсніла захоп Заходняй Беларусі, будучых „крэсаў паўночна-ўсходніх”. Імкненне стварыць унітарную дзяржаву дыктавала Варшаве праводзіць асіміляцыю нацменшасцей (што, дарэчы, нівеліравала б факт захопу „крэсаў”), і ў гэтым бачыцца стратэгічна-гістарычны пралік II Рэчы Паспалітай: беларусы ў ёй сталі маргіналамі, тады, калі па ўсходні бок мяжы яны былі нібыта роўнымі сярод роўных і мелі свой „цэнтр”, сваю сталіцу. У многім дзякуючы таму праліку Савецкі Саюз і змог з лёгкасцю стварыць грунт для аб’яднання Беларусі пад саюзным дахам. У сувязі з гэтым нельга не пагадзіцца з акадэмікам М. Касцюком, што „ў тагачасных ваенна-палітычных абставінах аб’яднанне магло адбыцца толькі на савецкай аснове”[43] (праўда, думаецца, не абавязкова ў межах Беларускай ССР: перад інкарпарацыяй земляў Польскае дзяржавы існавала задума стварэння трох „дзяржаўных” фарміраванняў у выглядзе савецкіх рэспублік: Польшчы, Заходняе Украіны ды Заходняе Беларусі[44]).

[43] *Гісторыя Беларусі: У 6 т.*, т. 5: *Беларусь у 1917-1945 гг.*, Мінск 2006, с. 570.

[44] Падрабязней гл.: Т. Стжембош, *Введение: „Zachodnia Białoruś”. 17.IX.1939-22.VI.1941*, т. 1: *Wydarzenia i losy ludzkie. Rok 1939*, Warszawa 1998, s. 38-39. У такім выпадку стварэнне савецкае польскае рэспублікі дало б падставы для эвентуальнага аб’яднання яе з астатнімі польскімі тэрыторыямі, што трапялі пад германскую акупацыю. Задума з адваротнай дакладнасцю падобна да меркавання аднаго з дзеячаў III Рэйха Арно Шыкеданца, які займаўся германскімі зацікаўленнямі на ўсходзе. Ён не выключаў, „што ў выпадку нямецка-польскага канфлікту Саветы пад выглядам узброенай дапамогі Польшчы зоймуць” заходнебеларускія і заходнеўкраінскія абшары, у выніку чаго „Германія страціла б, напэўна, найбольш абяцальныя перспектывы расчлянення Расіі, тады як адцягнуўшы ўвагу Саветаў на пэўны час ад сумежных дзяржаў, Германія атрымала б немалую карысць. (...) Землі з беларускім і заходнеўкраінскім насельніцтвам мелі б неацэннае значэнне як асяродкі і базы для глыбокага расколу Расіі” (па: Ю. Туронак, *Беларусь пад нямецкай акупацыяй*, Мінск 1993, с. 27-28). Як бачым, Крэмль змяніў толькі матыў сваіх дзеянняў, але не сутнасць. Праз прызму працытаванага меркавання відавочна, што падзел II Рэчы Паспалітай, які адбыўся ў 1939 г., быў выгадны не столькі Германіі, колькі СССР.

Якія ж галоўныя высновы і вынікі можна абазначыць адносна развіцця беларускае праблемы ў святле імкненняў маскоўскіх палітыкаў? Найперш неабходна адзначыць, што ва ўмовах міжнароднае ды ўнутранае абстаноўкі бальшавіцкі Крэмль вымушаны быў не толькі не ігнараваць беларускую праблему, але і ісці на канструктыўнае для беларускага народа яе вырашэнне (спачатку). Аднак, як прадказвалася некаторымі, а затым і выявілася практычна, гэта быў толькі своеасаблівы, але меркантыльны, крок назад для бальшавікоў (як зрэшты і, напрыклад, НЭП у савецкай эканоміцы). Беларусізацыя і так званае ўзбуйненне гралі тактычную ролю: 1) давалі магчымасць раскрыцца нацыянальнаму патэнцыялу ў Савецкай Беларусі, 2) кшталтавалі сімпатыю ў „заходнікаў”, перацягваючы іх на свой бок, — у выніку па абодвух гэтых пазіцыях беларускі нацыянальны рух чакала доля элімінацыі, як духоўнае (знішчэнне гістарычна-культурнае спадчыны), так і фізічнае (рэпрэсіі супраць інтэлектуальнае і эканамічнае эліты). Галоўнай мэтай па-імперску нацэленых крамлёўскіх палітыкаў з’яўлялася пашырэнне межаў савецкае дзяржавы, і Заходняя Беларусь разглядалася стрfavanай толькі на пэўны, але нядоўгі, час. У першай палове 1920-х гадоў далучыць гэтую тэрыторыю не дазволілі неспрыяльныя ўмовы. І калі стала відавочна, што далучэнне Заходняй Беларусі — справа не імгненная, то Масква павяла задабральную палітыку перацягвання з II Рэчы Паспалітае ды іншых краін у БССР нацыянальных дзеячаў, каб: 1) яны не дабіваліся арганізацыі „беларускага П’емонта”, 2) увогуле элімінаваць беларускі нацыянальны рух на абедзвюх частках Беларусі, зрабіўшы краіну і яе дзеячаў абсалютнай марыянеткай бальшавіцкае палітыкі шляхам ліквідацыі перадусім актывістаў БНР. Часткова ход удаўся. Таму неабходныя для сябе ўмовы (перадусім стварэнне на розных узроўнях палітыкі думкі пра адзіна справядлівы савецкі варыянт аб’яднання Беларусі) Масква вырашыла падрыхтаваць сама і стварыць, калі можна так сказаць, „беларускую метраполію” з мэтай эвентуальнага далучэння да яе заходнебеларускіх зямель, пастараўшыся зрабіць немагчымымі іншыя, нават толькі тэарэтычныя (для тае сітуацыі) варыянты, у тым ліку перадусім самастойнага аб’яднання беларусаў. Такой Беларусь уступіла ў 1939 г., які даказаў адносную паспяховасць папярэдняе маскоўскае палітыкі ў падыходах да дадзенае праблемы, стаўшы заадно для беларускіх зямель аб’яднаўчым у рамках савецкае імперска-таталітарнае дзяржавы.

На завяршэнне варта дадаць, што зліццё дзвюх частак аднаго народа, да чаго прывялі падзеі міжваеннаго перыяду, у дадзеным выпадку не столькі ёсць вынікам іманентнае нацыянальнае эвалюцыі (хоць і гэты фактар тут адыграў сваю ролю, падрыхтаваўшы адпаведную глебу, па-марксісцку кажучы, базіс), колькі з’яўляецца абумоўленым логікай

працэсу гісторыі. Логіка заключаецца ў тым, што вынікі Першае сусветнае вайны, Версальска-Вашынгтонская сістэма, былі відавочна няўстойлівымі, і многія дзяржавы (у першую чаргу Германія ды СССР) імкнуліся да перабудовы свету паводле сваіх геапалітычных меркаванняў. Аднак імі не былі адэкватна засвоены ўрокі 1914-1918 гг., галоўны з якіх дэкляраваў, што сусветная вайна нясе разбурэнне імперыям, а не іх стварэнне ці замацаванне[45]. Таму дзяржаватворчы працэс Беларусі, перарваны ў міжваенны перыяд, заканамерна меў актыўны працяг падчас чарговае глабальнае вайны (трэба заўважыць, што акрамя аб'яднання 1939 г., Беларуская Рэспубліка стала адной з заснавальніц ААН), а вынікам „халоднага" капіталістычна-сацыялістычнага супрацьстаяння, званага трэцяй сусветнай вайной, з'явілася ўтварэнне суверэннае Рэспублікі Беларусь.


**Streszczenie**

Traktat ryski, który podzielił Białoruś, nie zaspokajał aspiracji ani bolszewików, ani Polaków. Polskie elity polityczne ukierunkowały politykę państwa na zachowanie istniejącego stanu rzeczy, bolszewicy zaś od początku przyjmowali rozwiązanie jako tymczasowe. Tworząc Białoruską Socjalistyczną Republikę Sowiecką komuniści dawali do zrozumienia, że szanują aspiracje narodowe elit białoruskich, które bardzo wyraźnie zostały objawione w postaci Białoruskiej Republiki Ludowej. Nurt narodowy był jednak przeszkodą na drodze do światowej rewolucji internacjonalistycznej, dlatego musiał być zniszczony. Dokonano tego z właściwą bolszewikom przewrotnością. Białorutenizacja republiki miała pokazać potencjał narodowy, wyodrębnić elity. Kilka lat później twórców i organizatorów białoruskiego życia intelektualnego zgładzono. Poszerzenie granic BSRS w latach 1924-1926 miało na celu stworzenie takiego potencjału demograficznego, który mógłby stanowić odpowiednią platformę do przyłączenia Białorusi Zachodniej. Białoruś Sowiecka w granicach z 1921 r. była znacznie mniejsza od areału białoruskiego, który znalazł się w granicach Polski. Planowano, że w chwili wybuchu białoruskiego powstania narodowego w Polsce takie powstanie „wybuchnie" także w BSRR pod hasłem zjednoczenia wszystkich ziem białoruskich. ZSRR, podobnie jak Polska, oficjalnie występowałby wówczas w roli pokrzywdzonego podmiotu, faktycznie zaś byłby protektorem marionetkowego państwa.


[45] Д. Г. Наджафов, *Советско-германский пакт 1939 года: переосмысление подходов к его оценке*, [у:] http://www.rus-lib.ru/book/35/36/36-4/154-165.html#_ftn1.